з першых даследчыкаў Б., у гутарковай мове гэты тэрмін быў сінанімічны словам *«казка»*, *«легенда»*, *«паданне»*, *«анекдот»* і азначаў любы вусна-паэтычны апавядальны твор з выдумкай. Напрыклад, у *дакучных казках* «баяць» азначае «апавядаць казку»: «Ішоў бай па сцяне ў чырвоным жупане. Баяць ці не? — Баяць. — Ішоў бай па сцяне...» і г.д. Тэрміны «Б.» і «казка» атаясамліваюцца ў казках-небыліцах: «Вельмі любіў той пан слухаць казкі. Хлусіць хто якую байку, а ён усё за кожным словам кажа: «Праўда, так» (казка «Брахня»); «— Добра, сынку, дам [агню], толькі ты перш збай мне басеньку, скажы сказачку, тагды дам». А старшы брат быў вельмі ганорны, то й адказаў пустэльніку: — Хіба я здурэў, каб якомусь паршываму дзеду байкі баяў!» (казка «Тры браты і пустэльнік»).

*Літ.*: Гілевіч Н.С. Народныя казкі-байкі, апавяданні і мудраслоўі. Мн., 1983.

*А. С. Фядосік.*

**БАЛАБА́ЙКА** Фёдар Якаўлевіч (н. 21.7.1949, г. Магілёў), танцоўшчык. Заслужаны артыст Беларусі (1978). З 1974 саліст харэаграфічнага ансамбля *«Харошкі»*. Выканальніцкі стыль танцоўшчыка вылучаецца жыццярадаснасцю, гратэскавай манерай падачы матэрыялу, віртуозным тэхнічным майстэрствам, артыстызмам. Стварыў яркія пластычныя вобразы ў пастаноўках калектыву: «Гусарыкі», «Весялуха», «Субота», «Пава», кадрыля «Лянцей», «Віцебская полька», «Местачковы вальс» і інш.

*С. В. Гуткоўская.*

**БАЛА́ДА** (англ. ballad ад позналац. ballo танцую), ліра-эпічная песня, якая апавядае пра драматычныя і трагічныя калізіі ў асабістым, сямейным, часам грамадскім побыце чалавека. Упершыню на Беларусі характарыстыку жанра Б. ў пачатку 19 ст. даў А.Міцкевіч, паказваючы ўзоры сваіх твораў баладнага жанру, заснаваных на матывах бел. фальклору. Гэту тэндэнцыю працягвалі інш. мясцовыя паэты, прыхільнікі рамантычнай плыні ў літаратуры. У адносінах да фалькл. песеннага жанру тэрмін «Б.» сталі прымяняць даволі позна, у канцы 19 ст. (У.Дабравольскі). Носьбіты нар. Б. абазначалі іх як «доўгія песні», «смутныя», «жаласныя», «абы-калі», «так песні», «быль». Спроба збіральнікаў (У.Вярыга) аб'яднаць творы гэтага жанру пад назвай «думкі» не замацавалася ў бел. народазнаўстве. У цэнтры ўвагі стваральнікаў Б. — маральна-этычныя тэмы: барацьба дабра і зла, сутыкненне любові і нянавісці, вернасці і здрады, канфлікт паміж пакаленнямі (нявестка і свякроўка, маці і сын), паміж прадстаўнікамі розных слаёў грамадства, сваімі і чужымі, захопнікамі і абаронцамі радзімы і інш. Б. праслаўляе стойкасць чалавека ў трагічных сітуацыях, яго вернасць радзіме, сям'і (роду), абавязку, справядлівасці. У адпаведнасці з паважнасцю зместу, нештодзённасці зместу падзей, якія патрабуюць роздумнага асэнсавання, Б. выпрацавала няспешны апавядальны тон раскрыцця зместу з ужываннем паўтораў, якія зацягваюць аповед, і часткова рэфрэнаў, што настройваюць і выканаўцаў і слухачоў на ўспрыняцце Б. ў адпаведным паважным ключы (асобныя ўзоры, дзе жартоўны тон нарацыі не адпавядае драматызму зместу, з'яўляюцца выключэннем, што падкрэсліваюць агульнае правіла). Будова бел. Б. як звычайна страфічная, найчасцей — 2-радковая страфа з паўторам 1-га і 2-га радка, з нячастым спецыфічным роздумным рэфрэнам («Люлі, люлі», «Ду́ма мая, ду́ма над думой!») ды шэрагам прыпеваў, характэрных для абрадавай паэзіі. Б. адносяць да пазаабрадавай творчасці, аднак нават у межах аднаго сюжэта можна сустрэць варыянты абрадавага прымеркавання. Асобныя сюжэты маюць вельмі шырокае прымеркаванне, што патрабуе спецыяльнага вывучэння для вызначэння карэннай прывязкі твора. Некаторыя сюжэтныя тыпы Б. — вынік драматычных абставін, што ўзнікалі пры неаднолькавым падыходзе да вымог архаічных звычаяў, абрадаў («Ціхоня», «Браткі» і інш.). Некаторыя Б. з'яўляюцца па сутнасці песенным пераказам этыялагічных міфаў («Маці заклінае сына ў явар»), іншыя ўключаюць толькі асобныя міфалагічныя матывы. У бел. фалькл. спадчыне, багатай абрадавымі традыцыямі, шмат баладных сюжэтаў звязаны глыбіннай сувяззю з веснавым, купальскім, летнім, восеньскім перыядам абрадавага гадавога цыкла. Б. з'яўляецца не адасобленым, абмежаваным па часе выканання песенным жанрам, як, напрыклад, *валачобныя песні*, *купальскія песні*, калядныя і інш. Яны ёсць у розных перыядах, таму нар. спевакі выконваюць іх у любы час. Аднак разгор-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ імя М. ТАНКА